**Сёлета адбудзецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі**

**Прадстаўнікі Беларусі на паседжаньні кіроўнага камітэту НАТА**

**Створаны аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы супраць будаўніцтва АЭС**

**Беларуска-польскі эканамічны форум**

**БХК вылучыць свайго кандыдата ў прэзыдэнты**

**Абвешчана “Амбасовішча-2009”**

**Міліцыянт-пачатковец атрымлівае заробак двух галоўных інжынэраў**

Афіцыйны візыт у Менск лібійскага кіраўніка Муамара Кадафі быў значным для яго беларускага калегі Лукашэнкі, які пакуль працягвае заставацца для Захаду непажаданым суразмоўцам. Нягледзячы на высілкі прапагандысцкай машыны Лукашэнкі, ніякіх сэнсацыяў камунікацыя кіраўнікоў Беларусі і Лібіі не прынесла.




Развіцьцё стасункаў паміж дзьвюма краінамі будзе адбывацца і далей у асноўным у вайсковай і вайскова-тэхнічнай галінах: усяго толькі ў навучаньні лібійскіх курсантаў у беларускай Вайсковай акадэміі і рамонце савецкай вайсковай тэхнікі беларускімі адмыслоўцамі. Пра вельмі пажаданыя для беларускай эканомікі крэдыты, якія багаты лібійскі лідэр мог бы даць, гаворкі не вялося.

Бадай што, найбольш важнымі для Беларусі падзеямі сталі дзьве нарады, якія Лукашэнка правёў у сваёй рабочай рэзыдэнцыі.

На нарадзе па пытаньнях унутранай і замежнай палітыкі дзяржавы Аляксандар Лукашэнка заявіў 30 кастрычніка, што заплянаванае на канец лістапада паседжаньне Вышэйшага дзяржаўнага савету Саюзнай дзяржавы будзе “асаблівым”. “Нам давядзецца ў канцы лістапада правесьці Вышэйшы дзяржсавет, гэта будзе асаблівы дзяржсавет”, – падкрэсьліў беларускі лідэр. Паводле ягоных словаў, на ім плянуецца разгледзець прынцыпіяльныя пытаньні. “Як старшыня Вышэйшага

## БЛОГ

Andrei Liakhovich, Miensk, Belarus

### Беларусь – Расея: паўза перад канфліктам

25 кастрычніка па ініцыятыве Лукашэнкі ў Маскве адбылася сустрэча прэзыдэнтаў Расеі і Беларусі.

Адзіным афіцыйна аб’яўленым вынікам сустрэчы стала перанясеньне даты паседжаньня Вышэйшага дзяржаўнага савету Саюзнай дзяржавы з 2–3 лістапада (як было заплянавана раней) на канец году. Калі верыць афіцыйнай інфармацыі, Лукашэнка прасіў пра датэрміновую сустрэчу зь Мядзьведзевым у Маскве, каб на працягу трох гадзінаў абмяркоўваць вельмі неканкрэтныя пытаньні падрыхтоўкі сустрэчы, што мае адбыцца.

Насамрэч жа абмяркоўваліся асноўныя пытаньні двухбаковых стасункаў.

Расея зьвязвае пастаўкі газу ў 2009 г. па цане менш за 200 USD за тысячу кубамэтраў з шэрагам крокаў з боку Беларусі. Павінна быць створаная адзіная рэгіянальная сыстэма супрацьпаветранай абароны. Беларусь павінна прызнаць незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі. Павінна пагадзіцца на расейскі плян аб’яднаньня грашовых сыстэмаў.У Маскве добра

разумеюць, што, прыняўшы гэтыя ўмовы, улада значна абмяжуе свае магчымасьці весьці дыялёг з Захадам.

Лукашэнка патрабуе, каб Расея шчодра плаціла за выкананьне Беларусьсю ролі "шчыта" і "фарпосту" перад Захадам і НАТА, за падтрымку на міжнароднай арэне. Гэтага, на думку беларускай улады, дастаткова: Расея не павінна патрабаваць большага. У прыватнасьці, Расея павінна прызнаць права Беларусі самастойна вызначаць характар стасункаў з Захадам. Павінна зьмірыцца з тым, што ўлада запрашае заходні бізнэс і адмаўляецца прадаць расейскім кампаніям кантрольныя пакеты акцый беларускіх прадпрыемстваў. І з тым, што ў беларускім грамадзтве, у тым ліку дзякуючы дзяржаўнай палітыцы, вельмі малая колькасьць грамадзянаў выступаюць за "сапраўдную", як яе бачыць Расея, інтэграцыю.

Антынатаўская дэманстрацыя, антынатаўскія заявы ў кастрычніку, нарэшце, асабістая просьба пра датэрміновую сустрэчу з прэзыдэнтам Расеі – усё гэта ў агульным кантэксьце дзеяньняў і публічных заяваў Лукашэнкі ня кажа пра тое, што ён хацеў прадэманстраваць Захаду магчымасьць хуткага спыненьня дыялёгу і новага развароту ў бок Расеі.

Лукашэнка хацеў вырашыць важныя пытаньні стасункаў з Расеяй, у тым ліку атрымаць танны газ, для таго каб мець больш сільныя пазыцыі для дыялёгу з Захадам.

Менавіта для таго, каб мець магчымасьць працягваць дыялёг з Захадам, Лукашэнка ў чарговы раз адхіліў патрабаваньні Расеі. Вызначэньне коштаў на газ адкладзенае на канец 2008 г. Улада гатовая да чарговага "газавага" канфлікту з Расеяй.

Зараз Расея можа толькі заявіць пра сваю катэгарычную нязгоду з прапанаваным Лукашэнкам варыянтам разьвіцьця беларуска-расейскіх стасункаў. Значэньне рэжыму Лукашэнкі як саюзьніка істотна ўзрастае ў сувязі з рухам Украіны і Грузіі ў НАТА, разгортваньнем у Польшчы і Чэхіі аб'ектаў супрацьракетнай абароны ЗША, іншымі нэгатыўнымі для Расеі падзеямі каля ейных межаў і ў сусьветнай палітыцы. Малаверагодна, што ў выпадку адмовы Лукашэнкі сaступіць патрабаваньням Расеі ўзімку будуць спыненыя пастаўкі газу і што Расея ў бліжэйшай пэрспэктыве зробіць іншыя канкрэтныя крокі дзеля таго, каб прымусіць афіцыйны Менск пайсьці на саступкі.

Разам з тым, калі Расея ў канцы 2008 году пагодзіцца разьвіваць стасункі ў 2009 г. на ўмовах Лукашэнкі, гэта будзе значыць усяго толькі даўгую паўзу перад канфліктам Беларусі і Расеі, у выніку якога дастаткова адавочна вызначыцца геапалітычны выбар Беларусі.

дзяржсавету, я буду рабіць усё, каб унесьці ў павестку важныя, істотныя пытаньні, якія датычацца самага галоўнага ў нашых стасунках. Іначай яго і праводзіць ня варта", – сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго меркаваньня, "трэба разгледзець прынцыповыя пытаньні, якія па сутнасьці ўплываюць на стасункі паміж нашымі дзяржавамі". "А такіх пытаньняў нямала", – адзначыў Аляксандар Лукашэнка.

Заўважны рэзананс атрымалі заявы Лукашэнкі наконт працы беларускай эканомікі ва ўмовах сусьветнага фінансавага крызысу.

Як лічыць А. Лукашэнка, з сусьветнага фінансавага крызысу Беларусь можа атрымаць некаторую карысьць. "Мы павінны скарыстацца цяперашняй сытуацыяй і зрабіць рашучыя крокі ў бок лібэралізацыі эканомікі і наагул жыцьця людзей, дэбюракратызаваўшы ўсю сыстэму. І да 1 студзеня ў гэтым пляне мы павінны зрабіць максымум", — падкрэсьліў прэзыдэнт. Пры гэтым дэбюракратызаваць сыстэму прэзыдэнт гатовы "аж да ўвядзеньня заяўнага прынцыпу рэгістрацыі прадпрыемства".

Ён таксама адзначыў, што менавіта зараз важна "зрабіць тое, чаго мы заўжды баяліся, і тое, чаго не зрабілі".

Лукашэнка даручыў ураду да 1 сьнежня вырашыць усе пытаньні, зьвязаныя з рэакцыяй беларускай эканомікі на фінансавыя непарадкі на сусьветных рынках. У прыватнасьці, будуць скарэктаваныя экспартныя плыні тавараў і пашыраная геаграфія рынкаў збыту. Пры гэтым усе прадпрыемствы павінны працаваць у звычайным рэжыме.

Шэраг экспэртаў выказваюцца скептычна пра намеры Лукашэнкі максымальна лібэралізаваць эканоміку да 1 студзеня, хаця бы таму, што падобныя справы так хутка ня робяцца. А экспэрт Уладзімер Тарасаў лічыць, што ў заявах Лукашэнкі пра лібэралізацыю эканомікі адчуваецца рука дасьведчанага піяр-мэнэджэра, такога як ангельскі лорд Цімаці Бэл, які працуе над паляпшэньнем іміджу Беларусі ў сьвеце.

У сярэдзіне лістапада ў Лёндане адбудзецца першы Беларускі інвэстыцыйны форум. Пройдзе ён у скрайне няўдалы для прыцягненьня інвэстыцыяў час. Калі яшчэ год таму можна было разьлічваць на разьмяшчэньне акцыяў беларускіх прадпрыемстваў за мяжой па высокіх коштах, то цяпер пра гэта казаць не даводзіцца. Зьдзівіць інвэстараў беларусам, па сутнасьці, няма чым, таму, каб зрабіць на іх уражаньне, патрабуюцца нейкія

экстраардынарныя крокі. Імі, хутчэй за ўсё, і зьяўляюцца заявы прэзыдэнта РБ пра лібэралізацыю і дэбюракратызацыю. Рэалізуецца гэта ці не, неістотна, важна тое, што будзе пра што паразмаўляць на форуме.

Тэмай нарады па пытаньнях дзяржаўнай гарантыі захаванасьці банкаўскіх унёскаў насельніцтва было пашырэньне абавязацельстваў дзяржавы перад укладчыкамі.

У сваім выступе Лукашэнка падкрэсьліў, што Беларусь аказалася сёньня ў больш выгодным становішчы перад глябальнымі эканамічнымі выклікамі, чымся іншыя краіны. Грунтам гэтай упэўненай пазыцыі зьяўляюцца два фактары.

Па-першае, тая мадэль разьвіцьця, якая рэалізуецца ў краіне, дадатна адлюстроўваецца на жыцьці людзей. А па-другое, гэта беларускі народ, які давярае і ўладзе, і банкаўскай сыстэме. Лукашэнка таксама патлумачыў, што неабходнасьць укараненьня дадатковых мэханізмаў па захаванасьці ўнёскаў грамадзянаў выкліканая і клопатам пра стабільнасьць нацыянальнай валюты, і імкненьнем абараніць інтарэсы людзей, якія захоўваюць грошы ў банкаўскіх установах. На думку старшыні праўленьня Нацыянальнага банку Беларусі Пятра Пракаповіча, прыняцьце гэтых дакумэнтаў – новая старонка ў разьвіцьці банкаўскай сыстэмы краіны ў кантэксьце лібэралізацыі эканомікі.


photo.bymedia.net

Нацыянальны банк Беларусі зь 1 студзеня 2009 году павышае патрабаваньні да мінімальнага памеру ўласнага капіталу банкаў, што прыцягваюць унёскі грамадзянаў. Мінімальны памер нарматыўнага капіталу для беларускіх банкаў, якія прэтэндуюць на атрыманьне права па прыцягненьні грашовых сродкаў фізычных асобаў, якія не зьяўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, ва ўнёскі, ці па адкрыцьці і вядзеньні іх банкаўскіх рахункаў, павялічваецца до сумы, эквівалентнай 25 млн. эўра. Зараз ён роўны суме, эквівалентнай 10 млн. эўра. Паводле старшыні праўленьня Нацбанку, такое рашэньне прынятае ў мэтах павышэньня гарантыяў захаванасьці грашовых зьберажэньняў насельніцтва ў беларускіх банках.

Літаральна адразу пасьля гэтай нарады Лукашэнка падпісаў дэкрэт пра гарантыі захаванасьці грашовых сродкаў фізычных асобаў, разьмешчаных на рахунках і ў банкаўскіх унёсках. Варта зьвярнуць увагу, што дзеяньне гэтага ж дэкрэту не распаўсюджваецца на грашовыя сродкі ў беларускіх рублях і замежнай валюце, разьмешчаныя на рахунках і ва ўнёсках у банках Рэспублікі Беларусь на індывідуальных прадпрымальнікаў. Ня выключана, што гэта можа спарадзіць новыя акцыі пратэсту тысячаў грамадзян, якія займаюцца дробным бізнэсам.

Сёньня ліцэнзію мае 21 банк, зь якіх толькі 7 ня маюць нарматыўнага капіталу ў 25 млн. эўра. Астатнім банкам будзе дадзены


photo.bymedia.net

год для нарошчваньня капіталу. Дакумэнты таксама прадугледжваюць стварэньне ў краіне Агенцтва па гарантаваным кампэнсаваньні банкаўскіх унёскаў. Капітал агенцтва будзе сфармаваны ў аб'ёме Br275 млрд., які надалей будзе павялічаны да сумы, што складае ня менш за 5% ад усіх унёскаў насельніцтва. Агенцтва разглядаецца як дадатковы, эфэктыўны інструмэнт абароны інтарэсаў укладчыкаў і павышэньня такім чынам прывабнасьці беларускай фінансавай сыстэмы.

Паводле некаторых дадзеных, нэрвовую рэакцыю ў кіраўніцтве Беларусі і сярод чыноўнікаў выклікала паведамленьне Міжнароднага рэйтынгавага агенцтва “Standard & Poor's” (S&P). Яно панізіла прагноз крэдытнага рэйтынгу Беларусі са “стабільнага” да “нэгатыўнага”. “Зьмяненьне прагнозаў па рэйтынгу Беларусі адлюстроўвае неспрыяльны ўплыў міжнароднага эканамічнага і фінансавага асяродзьдзя на эканоміку краіны”, – гаворыцца ў прэс-рэлізе агенцтва.

“Значнае пагаршэньне ўмоваў гандлю на тле зьніжэньня попыту з боку ключавых экспартэраў узмацніць ціск на балянс бягучага рахунку пры абмежаваным доступе да замежнага фінансаваньня і абмежаванай абароне пры нізкай

вонкавай ліквіднасьці”, – адзначаецца ў паведамленьні рэйтынгавага агенцтва.

На думку адмыслоўцаў S&P, у 2008 годзе дэфіцыт бягучага рахунку складзе каля 3,6 млрд. даляраў, ці 7% ВУП. Пры гэтым у агенцтве прагназуюць паслабленьне экспартнага попыту, у тым ліку і ад ключавых гандёвых партнэраў у СНД. Гандлёвыя ўмовы ў рэспубліцы пагоршацца з-за таго, што ў 2009 годзе пачнецца новы этап істотнага скарачэньня расейскіх газавых субсыдыяў.

“Стабільнае павышэньне ўзроўню валютных рэзэрваў і, у той жа час, прыняцьце мераў па ўмацаваньні вонкавай канкурэнтаздольнасьці і зьніжэньні залежнасьці беларускай эканомікі ад імпарту будуць умовамі для перагляду прагнозу зноўку да стабільнага. І наадварот, значнае павелічэньне дэфіцыту бягучага рахунку і далейшае пагаршэньне паказьніка вонкавай ліквіднасьці могуць прывесьці да паніжэньня рэйтынгу”, – дадалі ў S&P.

АФІЦЫЙНА

## Сёлета адбудзецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі

*Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі адбудзецца да канца 2008 году. Такую заяву зрабіў амбасадар Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы.*


photo.bymedia.net

Паводле яго словаў, “дыпляматычныя прадстаўніцтвы робяць усё, каб гэтая сустрэча адбылася”. Ліхавы падкрэсьлівае, што для гэтага ёсьць перадумовы і неабходнасьць.

Нагадаем, сёлета ўлетку неаднойчы зьяўлялася неафіцыйная інфармацыя пра магчымую сустрэчу Лукашэнкі і Юшчанкі, аднак кожны раз яна не пацьвярджалася.

ПАЛІТЫКА

## Прадстаўнікі Беларусі на паседжаньні кіроўнага камітэту НАТА

*У Брусэлі адбылося паседжаньне палітыка-ваеннага кіроўнага камітэту НАТА па пытаньнях працэсу плянаваньня й ацэнкі сілаў праграмы “Партнэрства дзеля міру”. Сустрэча праходзіла у фармаце “26+Беларусь”.*

Мэта паседжаньня – абмеркаваньне пытаньняў рэгіянальнай бясьпекі. Зь беларускага боку ў сустрэчы прымалі ўдзел прадстаўнікі Дзяржаўнага сакратарыяту Савету бясьпекі, Міністэрства абароны й МЗС.

ГРАМАДЗТВА

## Створаны аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы супраць будаўніцтва АЭС

*У Астраўцы створаны аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы супраць будаўніцтва АЭС.*

Яго ўтварылі сем грамадзянаў на чале з былым настаўнікам геаграфіі Міколам Уласевічам, паведамляе “Радыё Свабода”.

Заява да грамадзян і ўраду Беларусі прынятая ў сувязі з плянаваным будаўніцтвам АЭС у іх рэгіёне. У заяве гаворыцца, што сябры аргкамітэту не падзяляюць пляны будаўніцтва АЭС на тэрыторыі Нарачанска-Вілейскага запаведнага краю, паколькі лічаць, што гэтае месца можа ператварыцца ў яшчэ адну “чарнобыльскую дзірку” на мапе Эўропы.



naviny.by

“АЭС можа быць пабудавана ў самай сэйсмалягічнай зоне нашай краіны, паколькі менавіта ў Астравецкім раёне ў 1999 годзе адбыўся землятрус”, – гаворыцца ў заяве.

У ёй таксама адзначаецца, што “будаўніцтва АЭС у постчарнобыльскай Беларусі ня проста памылка, а злачынны намер, які можа прывесьці да яшчэ большай бяды, чым тая, што здарылася на нашай зямлі”.

Сябры аргкамітэту заклікаюць усіх грамадзянаў Беларусі, якім неабыякавы яе лёс, далучыцца да іх ініцыятывы й разам супрацьстаяць будаўніцтву АЭС.

У склад аргкамітэту ўваходзяць вэтэраны Вялікай Айчыннай вайны, працы, а таксама адзін рабочы й індывідуальны прадпрымальнік. Некалькі дзён таму яны падалі заяву ў райвыканкам на правядзеньне пікетаў супраць будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне.

ЭКАНОМІКА

## Беларуска-польскі эканамічны форум

***4–5 лістапада ў Менску прайшоў беларуска-польскі эканамічны форум "Добрасуседзтва". Гэта ўжо дванаццатая па ліку сустрэча падобнага тыпу.***

Форум прысьвечаны тэме новых інвэстыцыйных магчымасьцяў для двухбаковага эканамічнага партнэрства.

Як паведамляе БелаПАН, удзельнікамі форуму сталі кіраўнікі й адмыслоўцы органаў кіраваньня, міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і фірмаў абедзьвюх краін. Мэта форуму – азнаёміць адмыслоўцаў Беларусі й Польшчы з актуальнымі эканамічнымі праблемамі й кірункамі супрацы ў галіне інвэстыцыяў.

У рамках сустрэчы 4 лістапада адбылося пленарнае паседжаньне з выступамі афіцыйных асобаў па пытаньнях узмацненьня беларуска-польскага эканамічнага супрацоўніцтва.

АПАЗЫЦЫЯ

## БХК вылучыць свайго кандыдата ў прэзыдэнты

***Беларуская хрысьціянская дэмакратыя заявіла аб намеры вылучыць свайго кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах у 2011 годзе. Такое рашэньне было прынята падчас канфэрэнцыі "Хрысьціянская дэмакратыя й беларускі рух", якая адбылася 1 лістапада й была прысьвечаная 81-й гадавіне ад моманту заснаваньня Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі.***

У сакавіку 2009 году плянуецца заснавальніцкі зьезд партыі. Адной з галоўных мэтаў БХК стане вылучэньне свайго кандыдата ў прэзыдэнты ці падтрымка найбольш уплывовага кандыдата ад дэмакратычных сілаў Беларусі, якім, хутчэй за ўсё, стане Аляксандар Мілінкевіч.

КУЛЬТУРА

## Абвешчана "Амбасовішча-2009"

***Амбасада ЗША абвесьціла пяты па ліку фэст "Амбасовішча", які адбудзецца ў чэрвені 2009 году.***

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца ахвотныя беларускія музыкі, якія дашлюць на адрас амбасады свае запісы і кароткія зьвесткі пра сябе. Ніякіх жанравых ці моўных умоваў да музыкаў не выказваецца. Галоўнае, каб прадстаўленыя матэрыялы былі ўласнымі. Пераможцы "Амбасовішча" будуць вызначаныя падчас галасаваньня.

ТЭНДЭНЦЫІ

## Міліцыянт-пачатковец атрымлівае заробак двух галоўных інжынэраў

***Зь першага лістапада беларускія міліцыянэры сталі яшчэ больш шчасьлівымі: ім паднялі заробкі, бо павысілася тарыфная стаўка. Цяпер нават участковы-пачатковец у сталіцы атрымае мільён дзьвесьце тысяч беларускіх рублёў – як, напрыклад, пажылы кандыдат навук, дацэнт Белдзяржунівэрсытэту.***



photo.bymedia.net

Але, нягледзячы на такія райскія ўмовы, дэфіцыт участковых у сталіцы – аж дзевяць адсоткаў. Пайсьці працаваць у міліцыю можа любы выпускнік ВНУ – гісторык, філёляг, фізык... Праца ўчастковым – адказная і нэрвовая, хоць абараняць кандыдацкую дысэртацыю для гэтага і ня трэба.

*Даніла Стрыжак, "Эўрапейскае радыё для Беларусі"*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

ERB
EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap.
The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.